БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

АДНАДНЁЎКА.

Цана 500 м. п.

Вільня, Серада, 23 трауня, 1923 году.

Наша доля.

Віленскі Акружны Суд выняс пастанову зачыніць яшчэ адну газэту „Новае Жыцьцё“. Апошні № 13 быў сканфіскаваны па загаду Камісара Ураду гор. Вільні.

Такая ўжо наша тутэйшая доля!

Добры прыклад.

Даўно вядома, што ў часе француска-прускае вайны 1870-71 г.г, французаў перамог нямецкі народны вучыцель.

Сіла немцаў была тады ня гэтулькі ў іх лічэбнасьці і ваенных здольнасьцях, сколькі ў высокай культурнасьці народных масаў.

І ўкожным змаганьні між двума народамі перамагае той, хто мае вышэйшую культуру, ў каторага прасьвета масаў стаіць вышэй.

Расейскі ўрад у часы панаваньня цароў добра гэта разумеў і дзеля гэтага пазбаўляў „інародцаў“ школы ў роднай мове. Замест апошняе ўсюдых закладаліся расейскія ўрадовыя школы, чужыя нам і па духу, і па мове.

„Інародцаў“ гэтым спосабам царскаму ўраду ўдавалася да часу перамагаць. Але затое вялізарную Расейскую імпэрыю за 10-міліённай арміяй перамаглі ў некалькі разоў слабейшыя лікам, але ў гэтулькі-ж разоў культурнейшыя немцы.

Па тэй-жа дарозе, па якой ішла царская Расея, ідзе цяпер „дэмакратычная“ Польшча. Школы ў роднай нашай мове нам не даюць, а ў ладжаныя ўрадам польскія школы народ наш або зусім ня йдзе, або йдзе вельмі рэдка і вельмі неахвотна.

А тым часам вучыць дзетак трэба. Трэба ратаваць іх ад зьдзічэньня, ад цемнаты. І вось, ня гледзячы на ўсе забароны, беларуская прасьвата ўсё больш і больш шырыцца.

Мы ведаем цэлы доўгі рад прыпадкаў, калі школьныя інспэктары забаранялі адкрываць беларускія школы, ці то зусім ня прыймалі просьбаў аб пазваленьне на іх адкрыцьце, хаця ня мелі самі на гэта права; але людзі моцныя духам і пранікнутыя ідэяй не апускалі дзеля гэтага рук і-ткі вучылі дзетак сваей вёскі чытаць і пісаць у роднэй мове. Адны забіралі невялічкія групы вучняў—„камплекты“—і, як некалі ў царскія часы, вучылі ў простых хатах, пераходзячы ад гаспадара да гаспадара, бяз лавак школьных і бяз ніякіх вучэбных дапамогаў. Другія асьмеліваліся адкрываць запраўдныя школы, якія, як нелегальныя (бо школьныя інспэктары не давалі дазволу), закрывала раней ці пазьней паліцыя. А ўсё-ж навука йшла, ідзе і—ісьці далей будзе!

Хто запраўды хоча вучыць дзетак у роднай мове, той заўсёды здолее гэта рабіць тым ці іншым спосабам. Штрафы, накладаныя за гэткую прыватную навуку, ня маюць у сабе нічога страшнога, ці ганьбючага: гэта проста кара за невыпаўненьне фармальнасьці, хоць і не з віны пакаранага.

Гледзячы па тое, што робіцца цяпер у беларускай вёсцы, успамінаюцца тыя кары, што накладала расейская царская ўлада на „інародцаў“, вінаватых у «нелегальным» навучаньні. З вялікім шумам накідалася паліцыя на „тайныя“ школы, як-быццам на нейкую змову проці гаспадарства. А суд, якому аддавалі на разгляд „праступак“ патайнага вучыцеля, караў штрафам у тры рублі..

Асабліва пашыралі такім спосабам прасьвету ў роднай мове... палякі! З іх і трэба нам браць гэты добры прыклад.

Ст. Мірскі.

З газэт.

Другая мазурская калянізацыя.

„Przegląd Wileński“ у № 9 пад павешым загалоўкам зьмяшчае стацью у якой пароўнывае сучасную калянізатарскую палітыку Польшчы з тым, што было шмат вякоў таму назад, калі палякі перш аружнай сілай, а пасьля калянізацыяй зьнішчылі цэлае літоўскае племя—Ядзвінгаў,—піша:

„У 1921 г. распачалася *другая* мазурская калянізацыя. Насамперш што тут, то там на Беларусі зьяўляецца асаднік, праз год прыбыло ўжо іх болей, а ў хуткім часе маецца распачацца калянізацыя ў шырок'м маштабе. Год таму назад была мова толькі аб асадніцтвэ здэмабілізаваных жаўнераў, як аб адзінай мэці задуманай парцэляцыйнай акцыі. Канец 19 2 і пачатак 1923 г. прынёс значны зварот: з уласьцівым эндэцыі цынізмам, маючыя ўплыў чыньнікі як урадовыя, так і неўрадовыя, сталі разьвіваць пад яе ўплывам праграму *поўнага* апалячэньня беларускіх і украінскіх крэсаў, шляхам фарсаванай мазурскай калянізацыі.

Нядаўна адзін з „narodowych“ дзеячоў, відавочна маючы з гэтага пункту гледжаньня нячыстае сумленьне, так гаварыў на адным сабраньні партыйных прыяцеляў: „нашая калянізацыя ня мае нічога супольнага з гакатай! Гаката імкнецца да павялічэньня нямецкай уласнасьці на чужой тэрыторыі, ў тоў час як мы ўзмацоўваем сваю зямельную клясу на ўласнай тэрыторыі“. Гэтае разважаньне было-б ня дрэннае, каб ня тое, што немцы Пазнаншчыну так сама лічылі за належачы да іх абшар, ня гледзячы на этнаграфію і гісторыю! Наперакор гэтым сафістычным вывадам па сутнасьці знойдзем поўнае падабенства паміж аднымі і другімі.

Ды вось, як з дакананым фактам трэба лічыцца з другою мазурскаю калянізацыяй, на гэты раз ня стыхійнай, але пляноваю і не Падляшша ўжо, але ўсей Заходняй Беларусі і Украіны.

Ці удасца?

Залежыць гэта будзе шмат ад якіх акалічнасьцей, між іншым ад адпорнасьці, на якую могуць здабыцца беларусы і Украінцы“.

Мы пераконаны, што наш народ, ня гледзючы на страшэнна трудныя варункі яго сучаснага жыцьця, знойдзе ў сабе досьць здаровай жыцьцёвай сілы і волі, каб даць адпор залівающай яго хвалі польскай калянізацыі, і што удалося шэсьць вякоў таму назад над Ядзьвінгамі, то ня удасца цяпер над беларусамі і украінцамі, і ўсе пляны твораў людаедзкай палітыкі разьвеюцца як дым.

Візыт Фоша.

„Земля і Воля“ ў № 20 абгаварываючы паездку маршалка Фоша, які зьяўляецца уасабленьнем ваеннай імпэрыялістычнай палітыкі Францыі, маючай на меці ўмацаваньне за ўсякую цану француской гегемоніі на эўрапейскім кантынэнце, апіраючыся на валізарную армію Францыі і яе саюзьніц,—піша, што гэтая паездка набірае асобай вагі, калі прыняць пад увагу прыбліжаньне да канца торгу паміж эўрапейскімі капіталістамі ў справе падзелу паваеннай спадчыны. Гэтая паездка ёсьць пагроза ў бок Нямеччыны, каб прымусіць яе быць болей падатлівай. Вось дзеля чаго

„... польскі імпэрыялістычныя парты, зарганізаваныя ў так званым хіенскім блёку, так пруцца да ўлады ў Польшчы, бо яны якраз зьяўляюцца выразьнікамі імпэрыялістычнай палітыкі Францыі на польскім грунце. Недарма і „Gazeta Warszawska“, і Rzeczpospolita“, і „Słowo Polskie“ расьпісываюцца пра неабходнасьць аружнай польскай інтэрвэнцыі проціў Нямеччыны яшчэ перад вырашэньнем Руррскага пытаньня“.

Адзначыўшы далей што і „вітасоўскія паско-пясты“ маглі-б таксама як і абшарнікі з капіталістамі пажывіцца пры гэтым і дзеля таго стараюцца як найхутчэй зьдзейсьніць гэты саюз з Хьенай, які зьяўляецца

„..... трыумфам рэакцыі—трыумфам ваенай палітыкі над мірнаю. Трыумфам павялічэньня уціску і вызыску работніцкай клясы, як у гарадох, так і на вёсках“.

Вось дзеля чаго

„Візыт маршалка Фоша азначае кантроль Францыі на сколькі Польшча спраўляецца з роляй ваеннага саюзьніка на усходзе Эўропы, на сколькі 400 мільёная „пазычка“ на ваенныя мэты — была адпаведна выкарыстана для ўмацаваньня польскага мілітарызму, а тым самым дяя ўмацаваньня ваенных сія Францыі“.

Крэсовыя патрыоты.

Усім ясна, што б. польскага народу у сучасны мамэнт перажывае чад патрыатызму, створанага эндэцыяй і клерыкаламі, каб у імя «ojczyzny» лягчэй было экcплеатаваць адурманеныя рабочыя масы. Асабліва хворыя, дзікія хвормы прыняў гэты патрыатызм тут на „крэсах“, дзе вачавідная меншасьць палякаў, належучых да заможнай клясы ці лепш кажучы, калісь апалячаная беларуская шляхта, якой родныя карані не даюць магчымасьці дасьцігнуць варшаўскай польскасьці. Сьмех і жаласьць чуеш да гэтых бяздушных натур, пакалечаных паганым шовінізмам, выбітых з каляіны жыцьця.

У Баранавічах ёсьць такі сабе панок Г. З радасьці, што дачакаў незалежнай Польшчы, якая дала яму ў падарак лёгкі хлеб — краму, — ён калі ня сьпіць, дык пьець і калі ня пьець, дык сьпіць. І каб незалежнасьць доўга жыла, дык перад кожнай чаркай у самых нават агідлых мейсцах крычыць: „Niech żyje Polska!“

Прысутная пры гэтым публіка, ня ведае як рэагаваць на патрыатычны тост. А ў гэты самы час п. Г. пачынае абходзіць сталы і чокацца за „wielką Polskę“.

Часамі гэтае патрыатычнае пачуцьцё даходзіць да шаленства, тады ён пачынае скакаць паміж сталамі, пад сьмех прысутных.

Пан Г. вельмі вясёлы і рухлівы чалавек. Ен ня вялікага росту, на моцных нагах: шырокія плечы, тоўсты карак і на ім цьвёрда сядзіць галава, якая варочаецца разам з усім тулавам.

У п. Г. ёсьць у Баранавічах сельска-гаспадарчая крама, якую ён вядзе разам з сваім спульнікам. Часта — густа п. Г. прыходзіць у краму ўжо добра заліўшы за гальстук. Раз было так, што ён у краме заснуў глыбокім сном. Сяляне, якія заходзілі ў краму, дзівіліся з надзвычайнага крамніка: адчыняная крама, нікога няма, а гаспадар сьпіць, як пшаніцу прадаўшы. Сьмекалістыя сяляне рашылі, што момант падходзячы і давай нагружаць вазы.

Так бы і прапала ўсё, каб не прышоў спульнік і не адабраў ад сялян забранае імі. Цяпер спульнік п. Г. не пакідае ўжо больш яго аднаго ў краме, а калі настае вечар і краму трэба зачыняць, а п. Г. сьпіць у краме, дык яго спульнік зачыняе яго, а потым — праз гадзіны дзьве-тры прыходзіць і пабудзіўшы, выпушчае на волю.

Было аднак адзін раз так, што п Г. прачнуўся ў краме раней, чым прышоў яго спульнік. Бачучы што ён адзін у цёмнай краме і што выхаду няма п. Г. рашыў „прарубіць вакно“ да вызваленьня. Стукнуўшы некулькі разоў па шкле і прарубіўшы у ім здараненную дзірку, п. Г. вылез на вуліцу з парэзанымі рукамі і тварам.

Пан Г. вельмі ня скупы чалавек і любіць частаваць каго папала. Сам жа і гуляе і кампаньёна прымушае. Але мае вельмі дрэнную прывычку. Напьецца сам, напоіць кампаньёна, а потым пачынае з ім задзірацца бачучы у ім „здрадніка Польшчы“.

Адзін баранавіцкі жыхар акуратна яго аддубасіў пасьля папойкі і здавалася-б пазбавіў п. Г. ахвоты біць кампаньёнаў. Але п. Г. вялікі патрыот і не супакаіваецца змагацца з „ворагамі“ Польшчы.

Аднаго разу сустрэўся ён ў адным з Баранавіцкіх рэстаранаў з цыркавым сілачом і давай яго лаіць жыдам і выкрыкваць патрыатычныя лёзунгі. Цікава было глядзець, як п. Г. з размаху накідываўся на сілача і як той адным лёгкім рухам адкідаў яго, як чурбана. Потым у дзела умяшалася паліцыя і забрала п. Г. Калі яго вялі ў цыркул, дык нападаў на публіку і валіў яе ў рынштокі, крычучы аб сваім патрыатызме выносячы свае заслугі перад «ojczyzną» За п. Г. цягнуўся цэлы натаўп народу, дзівуючыся і сьмяючыся з новага тыпа у нашым быце, якога стварыла сучасьнасьць.

Яшчэ адзін факт з патрыатычных выступленьняў п. Г.

Рэстарацыя, Публікі мало. Гадзін 3—4 дня. Находзіць п. Г., падыходзіць да буфэту і пьець. „Niech żyje Polska!“ разлегаецца дакола. І піў, піў. Пан Г. скакаў, крычаў, выробляў усялякія фокусы, а потым вышаў і усеўся на стаяўшыя каля рэстарану дрогі ламавіка. Ян замахаў лейцамі над канем, ян закрычаў, конь кінуўся галопам і п. Г. памчаўся як чорт, пужаючы народ сваім дзікім выглядам.

Такіх крэсовых патрыотаў у нас хоць поле абнавозь; усім ім добра жывецца; бо ўмеюць крычаць „Niech żyje..“, а з чаго і як жыць мае, гэта іх не цікавіць, абы ім добра было.

Xi—xi.

Карэспандэнцыі.

м. Стоўпцы.

У Стоўпцах вельмі многа непаразуменьняў выклікае дзеяльнасьць мясцовых ўлад, якія зусім не лічацца ні з законамі, ні з правам уласнасьці. Так, напрыклад магістрат нядаўна навазіў на грамадзянскім пляцу, які да магістрату не належыць, дзерава і збіраецца неш-

та будаваць на зямлі стаўпецкіх сялян; бяз іх дазволу, пабудована польская „охронка“ і праэктуецца пастройка будынку пад польскую школу.

Само староства, якое, здавалася-б павінна-б было стануць на варце законнасьці і не дапушчаць праяваў самаўпраўства з боку розных улад, само дае нядобры прыклад тым, што забрала дзеля сваіх патрэб школьны будынак, пабудаваны яшчэ ў часы расейскага земства на грошы не казёныя, а грамадзянскія, і на зямлі падараванай пад школу стаўпецкім грамадзянствам. Ясна, што забіраць грамадзянскую уласнасьць бяз спросу у самага грамадзянства ня можна і каб гэта зрабіў хто-небудзь з прыватных асоб, дык яго пакаралі-б, як сьлед, але тут, бачыце забрало чужую уласнасьць само староства, якое на „Усходніх крэсах“ вышэй усякіх законаў, вышэй канстытуцыі, вышэй усяго.

У польскіх грамадзянскіх колах часта ламаюць голавы над тым, як заспакоіць „крэсы“, воража настроеныя проціў Польшчы і віяк ня могуць дагадацца, што каб перацягнуць тутэйшае грамадзянства на свой бок, дык трэба перш за усё перастаць над ім зьдзекавацца.

Ці-ж гэта ня зьдзек, што заступнік Стаўпецкага старосты заняў увесь дом гр. Паўлоўскага, а яго з сямьею з 6 душ загнаў у адзін маленькі пакойчык і сямья гіне ад цеснаты і духаты.

Грамадзянства Стаўпецкае абурана яшчэ і тым, што ў яго адбіраюць зямлю ня толькі староства і іншыя улады, але і жалезная дарога дзякуючы таму, што Стоўпцы зьяўляюцца пагранічнай станцыяй, польскі урад задумаў там пабудаваць вялікую пагранічную станцыю, дзеля чаго патрэбавалася павялічыць тэрыторыю станцыі. І вось прыехала з паўгода таму назад камісія, якая без паразуменьня з стаўпецкімі жыхарамі паставіла слупы і цяпер абвесьціла сялянам, што абслупованыя землі адыходзяць пад жалезную дарогу.

У некаторых гаспадароў адабрана ні больш ні менш, як 2 маргі, тады як яны валадалі 4—6 маргамі. Грошаў за адабраную зямлю не заплацілі і не зьбіраюцца у бліжэйшым часе выплачываць. Абяцаюць плаціць па 6 прац. каштоўнасьці зямлі ў год. Добры працэнт! Цікава вось яшчэ што: ня ведама калі начнецца будаваньне станцыі, а ужо забаронена сялянам карыстацца адабранаю зямлёю і сенажацьцю. Затое не забаронена жалезна-дарожным служачым расхопліваць гэтыя землі гдзе хто хош. На якой падставе усё гэта робіцца? Зусім дарэмна пытацца. Усім нам тут добра ведама, што ўсё гэта робіцца з прычыны уеўшагася у косьці польскай адміністрацыі паскуднага звычая зьдзекавацца над мясцоваю люднасьцю.

Ці-ж гэта ня зьдзек, што навокала Стоўпцаў у розных маёнтках панадавалі зямлі асаднікам, прыехаўшым ня ведама адкуль, а ў самых Стаўпцах адбіраюць у тутэйшых грамадзян іх землі, адлітыя іх крывёю і потам, запрацаваныя мазалямі і гарбамі. Што гэта за палітыка? Гдзе справедлівасьць? А яшчэ хочуць, каб мы былі добрымі і іх хвалілі.

Паблізу Стоўпцаў ёсьць вялікі маёнтак кн. Радзівіла Ен вельмі сьпешаецца распрадаць гэты маёнтак, бо баіцца, што яго адбяруць, калі пройдзе зямельная рэформа.

Чаму-б не забараніць князю прадаваць гэты маёнтак каму папала і не распарцэляваць яго дзеля патрэб стаўпецкіх грамадзян, пакрыўджаных жалезнаю дарогаю і мясцоваю адміністрацыяй. Але каму аб гэтым баліць? Мясцовае сялянства так і глядзіць, што польскія ўласьці ня думаюць каб палепшыць сялянскую долю, і выходзіць што селяніну нашаму астаецца толькі чакаць вароту паншчыны.

Нёман.

Высяленьне—даходная справа.

У вёску Пясочня, Нясьвіжсскага пав. прыехала паліцыя і забраўшы жыхара гэтай вёскі—шаўца павялі да бальшавіцкай граніцы. Там загадалі яму ісьці ў бок бальшавікоў, рэчы высланага аставілі ў сабе, не зважаючы на яго пратэсты і просьбы.

Ш.

З Менску.

Беларускі краевы музэй у Менску.

Год таму назад у быўшыя архірэйскія пакоі ўвайшла першая вучнёўская экскурсія, складаўшаяся з 15 дзяцей. Большасьць пакояў былі яшчэ ці пустыя ці завалены грудамі таго, што цяпер складае музэй. Толькі ў дзьве залі, абстаўленыя ўжо разобраным матар'ялам, можна было дапусьціць дзяцей. З цікавасьцю разглядалі вельмі вялікаю дзеці нябачаныя імі дагэтуль малюнкі, парцэляну, зброю, з увагаю слухаючы тлумачэньні кіраўніка.

Прайшоў год. Усьлед за гэтай экскурсіяй у дзьверы музэю шырокаю фаляй уліваліся новыя экскурсіі, аддзельныя групы і асобы. Сто экскурсіяў, а ўсяго да 10.000 асоб прайшло праз музэй за год. Цыфра гавора сама за сябе. Цікавасьць да музэя расьце, і кожную нядзелю залі музэю поўны публікай. Каго толькі тут няма: і рабочы, і чырвонаармеец, і студэнт, і грамада вучняў, мастак, і аматар старадаўнасьці і проста цікавы нэпман,—некаторыя ў трэці і чацьвёрты раз.

Іншы раз зойдзе з вёскі сялянін, да якога праз газэту дайшлі весткі аб музэі. Для такіх гасьцей музэй адчыняецца ва ўсякі час.

За год у музэй паступіла звыш 10.000 рэчаў (усяго больш 14000). Імі запоўнены ўжо 7 вялікіх заляў, у 2 пакоях зьбіраецца матар'яя для адчыненьня новых аддзелаў, у кладовай чакаюць сваёй чаргі другія экспонаты. Чакаецца паступленьне новых калекцыяў.

З глыбокім здаваленьнем можна сказаць, што зроблена вялікая культурная праца пры вельмі абмяжаваным штаце супрацоўнікаў. Значэньне музэю для ўсіе Беларусі відавочна, і пры дзейнай дапамозе Наркамасьветы і Інспэкцыі Навуковых Установаў, а таксама і грамадзянства, будучына і разьвіцьцё музэю забясьпечаны.

Запрашэньне новых прафэсароў.

У Менск вярнуўся прадстаўнік праўленьня унівэрсытэту, езьдзіўшы на Украіну, з мэтаю запрасіць для працы ў Б. Д. У выдатных вучоных. Выказалі жаданьне прыехаць у Менск вядомыя прафесары Цітаў, Крымаў, Руткевіч, Фінкэльштэйн і інш.

Знайдзены рукапісы Максіма Багдановіча.

У часы ярослаўскага белага паўстаньня, калі пры штурме места, загарэўся і пачаў палыхаць Яраслаўль, бацька паэты, маючы на руках неапублікаваныя яшчэ рукапісы свайго сына, зразумеў, што яму трэба перш за ўсё захаваць для працоўных мас Беларусі гэтыя скарбы.

Сярод рукапісаў знаходзіцца некалькі дзесяткаў вершаў апошняга пэрыаду творчасьці М. Багдановіча, нідзе не надрукаваных, бадай усе яго чарнавікі, пераклады з іншых моў, экзэмпляр „Вянка“ з папраўкамі паэты, яго артыкулы на расейскай мове, вялікая перапіска, якая часта насіла характар цаннейшых абгляда ў—досьледаў літэратурнай вартасьці, беларускі лемантар, над якім працаваў пісьменьнік, перадсьмяротныя лісты бацьку і таварышам і шмат іншага.

Больш пуда важаць гэтыя зборы рукапісаў.

У хуткім часе бацька паэта вядомы этнограф пераедзе на сталае жыцьцё ў Менск і перадасьць рукапісы у Інстытут Беларускай Культуры.

Беларусы у Амэрыцы.

Апошнімі часамі выходзячая ў Чыкаго расейская газэта „Свободная Россия“ удзяляе многа месца беларускаму руху і падае багата матарыялу з жыцьця на Бацькаўшчыне. Беларускія дзеячы робяць стараньні, каб уваўсей іншай прэсе пісалася многа аб Беларусі.

Місія Др. Нансена помачы галодным у Расеі, Украіне і Беларусі запрапанавала Беларускаму Камітэту ў Чыкаго ўзяць прадстўніцтва на перасылку з Чыкага пасылак у Сав. Бедарусь. Справу гэту ў найбліжэйшым паседжаньні Камітэт вырашыць.

Беларусы у Піттсбургу запрасілі грам. Я. Чарапука прыехаць дзеля прачытаньня лекцыі аб беларускім руху. Такія лекцыі былі прачытаны гр. Я. Чарапуком у Чыкаго і інш. местах Амэрыкі.

Паміж украінцамі і беларусамі ў Амэрыцы вядуцца перагаворы аб супольнай дзейнасьці ў змаганьні за незалежнаеьць Украіны і Беларусі. Па гэтаму пытаньню самая ўплывовая ў Злучаных Штатах Украінская газэта „Свабода“ № 93 памясьціла перадавую стацьцю, ў якой падробна абгаварывае сучаснае палітычнае становішча Беларусі і Украіны, заканчывае такімі славамі: „Абодва народы цяцер будуць стаяць у супольнай барацьбе проціў супольнага ворага, што раз дык больш будуць пазнавацца, а з той прыязні на будучыне, па асягненьню волі, можа ўнесьці і украінска-беларускі саюз дзеля далейшай абароны супольных інтарэсаў.

Народныя работнікі сярод абоіх народаў павінны, як найхутчей знайсьці дарогу і спосабы дзеля ўзаемнага паразуменьня і дзейнасьці і як найхутчэй пачаць супольную працу.

Шкоднікі садоў і барацьба з імі.

Яблакавы цьветаед (дауганосік).

Яблакавы цьветаед (даўганосік)—невялічкі жучок, цёмнага колеру, пакрыты шэрым пушком. Ен псуе галоўным чынам яблыню і ігрушу. Ен нясе свае яечкі ў яшчэ нерасьцвіўшыя пладовыя бутоны і ў цьветавыя почкі, якія пасьля гэтага ўжо не распускаюцца і гінуць. Прыблізна праз месяц з яечак выходзяць жучкі, якія зімуюць у шчэлках кары дрэваў. Рана вясной жучкі ўжо поўзаюць па дрэвах і грызуць почкі.

Каб знішчыць гэтага ворага садоў, пад дрэва падсьцілаюць якую-колечы падсьцілку ці брызэнт., затым бяруць драўляную калатушку ці палку, абматваюць яе трапкай і ня дужа моцна стукаюць на галінах дрэва Ад удараў жучкі звальваюцца на падсьцілку; пасля гэтага іх трэба зьмесьці ў вядро з варам ці з вадой і газай, а можна проста папаліць. Такое абтрасаньне трэба рабіць некалькі разоў, у залежнасьці ад таго, як будзе сыпацца жучок.

Добрым спосабам зьяўляецца апрысківаньне дрэваў вапенным малаком, пакідаючы некаторыя дрэвы неабрызганымі. Жукі вельмі ня любяць вапны і праз нейкі час усе зьбяруцца на неапрысканых дрэвах. Добра абтрасаючы гэтыя дрэвы, лягчэй будзе знішчыць жука.

Жучкоў можна таксама вылаўліваць лоўчымі паясамі, якія робіцца з пакульля, саломы і рызьзя, і накладаюцца на ствалы дрэваў у другой палове лета.

Ябланавая пладажорка.

Ябланавая прадажорка псуе галоўным чынам яблыню, значна менш ігрушу і інш. Гэта маленькі мятлічак, цёмна-шэрага колеру, з цёмнымі папярэчнымі палоскамі. Праз тыдні два пасля цьвіценьня дрэва самка-пладажорка пачынае несьці яечкі; асабліва ж многа яна нясе яечак праз месяц. Пасля гэтага, дзён праз 7—12, з яечак выходзяць чарвячкі, якія жывуць на лісьцях і ядуць іх, а пасьля пераходзяць на плады і ўгрызаюцца ў іх. Чарвяк жыве ў пладзе ад 20 да 30 дзён, а за тым, добра вырасшы, пакідае яго, спаўзае на ствол дрэва і там, найчасьцей пад карой ці ў шчэлках кары, ляжыць астатнюю частку лета, восень і зіму. Вясной з чарвяка робіцца кукалка, з якой праз месяц вылятае мятлічак.

Зьнішчыць пладажорку лягчэй усяго тады, калі яна, будучы яшчэ чарвячком, зімуе ў шчэпках кары. Дзеля гэтага трэба раньняй вясной абскабліць з дрэваў адмёршую кару на падсьцілку і спаліць яе.

Такім абскабліваньнем кары і розных лішаёў зьніштажаецца пладажорка, зімуючыя даўганосікі і розныя іншыя шкоднікі.

Пасьля абскабліваньня кары дрэвы трэба пабяліць вапнай, якая зьнішчае розны мох і лішаі на дрэвах і перашкаджае абсталёўвацца шкоднікам на зімоўку.

Ня шкодзіць апрача гэтага апрыскаваць дрэвы парыскай зелянінай, мыш'яком і інш.

Ябланавая моль (майскі-чарвяк).

Ябланавая моль псуе галоўным чынам яблыню і вельмі ёй шкодзіць. Гэта маленькі белакрылы з чорнымі кропкамі мятлічак зьяўляецца ў нас у сярэдзіне ці ў канцы мая, жыве блізка, што ўсё лета і нясе свае яечкі на гладкай частцы галінак. Вышаўшыя з яечак чарвячкі вялікімі партыямі пераходзяць ад аднэй галіны да другой, точачы лісьце.

Каб знішчыць гэтага шкодніка, трэба зараз жа, ян толькі пачнуць зьяўляцца на дрэве жаўцеючыя і сохнучыя лісьцікі, апрыскаваць дрэвы парыскай зелянінай, мыш'яком і г. д. Калі апрыскаваньне ня ўжывалася і чарвячкі акукліліся, дык трэба сабраць іх і спаліць.

Я. П.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу.

1) **Вільня**, Віленская вул. 12 кв, 6.
2) **Ліда**, II Слабодка 8, сэкрэтар Калясінскі.
3) **м. Глыбокае**, Дзісьненскага павету, вул. Сенкевіча 46.
4) **Жодзішкі**, Сьвянцянскага пав. кс. Годлеўскі.
5) **Наваградак**, Вялікі Рынак 14, сэкр. Ян. Біруковіч.
6) **Нясьвіж**, Альбянская 28, сэкр. Ян Шнаркевіч.
7) **Столбцы**. Шпітальная 22, Г. Сабалеўскі.
8) **Баранавічы**
9) **Горадня**, Мастовая 9.
10) **Валкавыск**, Пясковая 14.
11) **Бельск**, Замковая вул. 3, кв. 1 сэкр. Канстанты Карыцкі.
12) **м. Саколка**, Горадзенская вул. 34.
13) **м. Клешчэлі**, Бельск. павету.
14) **м. Крынкі**, Горадзенскага павету, Горадзенская вул. 34.
15) **Пружаны**. Вул. кс. Буткевіча, 16

Рэдактар-выдавец У. ЗНАМЯРОУСКІ, (Закрэтная, 5).

Друкарня Дворжэца, Завальная 32.